Андрэй Вашкевіч
(Гродна)

Мясцовыя арганізацыі Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі і Беларускага Інстытута Гаспадаркі і Культуры (1926-1936 гг.)

У красавіку 1926 года газета „Беларуская Крыніца" надрукавала даволі цікавы матэрыял, аўтар якога задаваўся рытарычным пытаннем: „дзе беларушчына стаіць лепш, тут, у Польшчы, ці ў Савецкай Беларусі?" Разважыўшы гэтае пытанне, аўтар прыходзіў да высновы, якая тады, у 1926 годзе, магла падацца не зусім лагічнай: „Бязумоўна з боку практычнага яна стаіць лепш там, у Савецкай Беларусі, але з боку маральнага яна стаіць вышэй у нас. У нас людзі церпяць за беларушчыну, а там? Там ня толькі ня церпяць, але нават не паклапоцяцца, каб навучыцца яе, ды яшчэ насьміхаюцца"[1]. На фоне тагачаснага амаль усеагульнага захаплення будаўніцтвам „беларускага дома" ў БССР словы гэтыя гучалі, напэўна, крыху дзіўна, але па сутнасці былі абсалютна праўдзівымі — менавіта ў Заходняй Беларусі 1920-1930-х гг. беларускі нацыянальны рух набыў найбольш шырокія і разнастайныя формы.

Нельга ўявіць сабе масавы нацыянальна-вызваленчы рух без удзелу мясцовых актывістаў, тых людзей, якія сваёй актыўнай грамадскай пазіцыяй сталі злучальным звяном паміж лідарамі руху і шырокімі масамі заходнебеларускага насельніцтва. Менавіта яны, часта рызыкуючы грамадскім статусам, працай, здароўем і нават жыццём стваралі ў вёсках і мястэчках Заходняй Беларусі гурткі Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады, Таварыства Беларускай Школы і Беларускага Інстытута Гаспадаркі і Культуры. Між тым даследаванняў, прысвечаных лакальным структурам беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, вельмі мала. Дадзеная работа, прысвечаная мясцовым арганізацыям Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі (БХД) і Беларускага Інстытута Гаспадаркі і Культуры (БІГіК), мае на мэце ў нейкай ступені запоўніць гэты прабел.

Да сярэдзіны 1920-х гг., у перыяд, калі беларускі нацыянальна-вызваленчы рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі пазіцыянаваўся як адзіная палітычная сіла, беларускім дзеячам, прыхільнікам хрысціянска-дэмакратычнай канцэпцыі развіцця грамадства, фактычна не было патрэбы ствараць фармальныя арганізацыйныя структуры ў вёсках і мястэчках Заходняй Беларусі. Суполкі Беларускай Хрысціянска-Дэмакратычнай Злучнасці (БХДЗ) як правіла функцыянавалі ў выглядзе гурткоў пры кас-

[1] „Biełaruskaja Krynica", 1926, 11.01, № 12, s. 3.

цёлах, якімі кіравалі ксяндзы-беларусы. Таму меркаваць аб сферы ўплываў беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў у паўночна-ўсходніх ваяводствах Польшчы ў сярэдзіне 1920-х гг. можна толькі на аснове ўскосных дадзеных. Напрыклад, добрую магчымасць для такога аналізу дае спіс падпісчыкаў перыядычнага органа беларускіх хадэкаў — газеты „Беларуская Крыніца". Усяго ў пачатку 1925 г. газета ў межах Заходняй Беларусі мела 870 падпісчыкаў. Адразу адзначым, што такая колькасць падпісчыкаў была вельмі немалой і пераўзыходзіла тагачасную колькасць падпісчыкаў газеты „Савецкая Беларусь", што друкавалася ў Мінску[2]. Асноўную масу падпісчыкаў газеты складалі жыхары Ашмяншчыны, Свянцяншчыны, Дзісненшчыны і Віленшчыны, г.зн. акурат тых паветаў, у якіх у пазнейшы час БХД атрымала найбольшую колькасць галасоў на парламенціх выбарах у 1928 г. і карысталася найбольшым уплывам. У сваю чаргу значнай папулярнасцю карысталася „Беларуская Крыніца" і ў паветах Беластоцкага і Навагрудскага ваяводстваў, дзе пражывала вялікая маса рымакаталіцкага насельніцтва, якая ў значнай ступені выказвала беларускую нацыянальную свядомасць. Гэта ў першую чаргу Гродзенскі, Сакольскі, Ваўкавыскі і Нясвіжскі паветы.

Табліца 1. **Колькасць падпісчыкаў газеты «Беларуская Крыніца» па паветах Заходняй Беларусі, пачатак 1925 года**

Павет	**Колькасць падпісчыкаў**
Дзісненскі	114
Ашмянскі	104
Свянцянскі	80
Віленскі	63
Гродзенскі	61
Дуніловіцкі	53
Нясвіжскі	50
Ваўкавскі	40
Сакольскі	38
Вілейскі	37
Валожынскі	35
Беластоцкі	30
Лідскі	30
Слонімскі	28
Пружанскі	18
Навагрудскі	18
Браслаўскі	15
Баранавіцкі	16
Пінскі	14
Лунінецкі	13
Стаўбцоўскі	13
Разам	**870**

Крыніца: «Biełaruskaja Krynica», 1925, № 5, с. 1-2.

Раскол беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, які адбыўся ў Заходняй Беларусі пасля стварэння шэрагам паслоў-беларусаў сеймавага клуба Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады (БСРГ), імклівы рост шэрагаў гэтай партыі, пераканалі беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў у неабходнасці стварэння сваіх фармальных структур у заходнебеларускай правінцыі. У снежні 1925 г. быў створаны Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры, а ў кастрычніку гэтага ж года — палітычная партыя — Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя[3].

Фактычна самым першым дакументам, які паведамляе аб лакальных структурах БХД яшчэ напярэдадні афіцыйнага стварэння палітычнай партыі, з'яўляецца „Спіс пляцовак БХД", складзены функцыянерамі II аддзела польскага генеральнага штаба ў сярэдзіне 1926 г. на аснове паведамленняў паліцэйскіх канфідэнтаў. У спісе прыводзяцца 72 населеныя пункты ў васьмі паветах Віленскага і Навагрудскага ваяводстваў, дзе беларускія хрысціянскія дэмакраты карысталіся значнымі ўплывамі (найбольш населеных пунктаў — 29, знаходзіцца ў Свянцянскім павеце). Спіс не з'яўляецца пералікам гурткоў БХД ці БІГіК, у ім згадваюцца як гурткі Інстытута, так і іншыя беларускія арганізацыі, напрыклад, кааператывы. Цікава адзначыць, што ў лік прыхільнікаў БХД улады залічылі як каталіцкіх ксяндзоў (кс. Гадлеўскі ў Жодзішках, кс. Аўгустыновіч у Лоску, кс. Семашкевіч у Лаварышках, кс. Закрэўскі ў Загорры, кс. Жук у Дзяркаўшчыне), так і „бальшавікоў", жыхароў вёсак Дзяркаўшчына і Тарлопы на Дзісненшчыне[4].

Табліца 2. **Спіс пляцовак БХД, восень 1926 года**

Ашмянскі павет	Свянцянскі павет
м. М. Лоск – кс. Аўгустыновіч в. Мураваная Ашмяна – В. Чаплінскі Ашмяна – К. Сэмет, І. Хас, І. Захароўскі в. Нездрачуны в. Плюсты – Ф. Субач м. Солы, в. Старая Будня м. Жупланы, в. Старынкі.	м. Жодзішкі – кс. Гадлеўскі, Антон Грышкевіч, Азавіч, Бас, Пётр Рагач. в. Клюшчаны в. Засвір м. Лынтупы – З. Шышкевіч, агент кс. Станкевіча м. Свенцяны – кааператыў „Вёска" пашырае беларускія газеты в. Ганута в. Палушы Лынгмянскай гміны в. Маркаўцы Жодзішскай гміны в. Дыбатоўка в. Дагатова Жодзішскай гміны

[2] „Biełaruskaja Krynica", 1925, 24.01, № 5, s. 1-2.

[3] Э. Мазько, *Дзейнасць Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі ў 1926-1935 гг.*, [у:] *Культура гродзенскага рэгіёну: праблемы развіцця ва ўмовах поліэтнічнага сумежжа*, Гродна 2003, с. 144-145.

[4] Centralne Archiwum Wojskowe, Oddział II Sztabu Generalnego, sygn. I.303.4.2696, s. 199-201.

	в. Дзевяткі Жодзішскай гміны в. Эявіле Жодзішскай гміны в. Куглі Свірскай гміны в. Бараны в. Буйкі в. Шэметава в. Хмылкі в. Свейкіне в. Яневічы в. Данішава в. Спахлічы гміны Вішнёва в. Абрамаўшчына м. Войстам в. Нестанішкі в. Пастажыня в. Кодзінета Жодзішскай гміны м. Гадуцішкі м. Свір – А. Кавлеўскі в. Дубнікі – Гурток Белар. Інст. Гасп. і Культ.
Віленска-Троцкі павет	**Дзісненскі павет**
м. Лаварышкі – кс. Семашкевіч в. Загорра Варнянскай гміны – кс. Закрэўскі в. Гульбаны – В. Дубіцкі в. Гервінты – К. Рынкевіч, С. Брасевіч м. Рудзішкі – І. Лашкевіч м. Вялікая Рэчка	в. Новы Пагост – Ф. Д. Гайлевіч в. Пагост – Клакоўскі м. Друя – Германовіч Людвік м. Лужкі – С. Урублеўскі в. Дзяркаўшчына – кс. Я. Жук, В. Малай, Я. Шабуніч – бальшавікі в. Шантараўшчына – Ст. Сянкевіч м. Міёры — Ст. Кукуць, Марголіс, Т. Былок м. Германовічы – Я. Жувас м. Глыбокае – В. Пяткевіч м. Касяны – Я. Цюнель в. Тарлопы гм. Лужкі – Канст. Лапа, М. Лапа – бальшав. Ул. Паўльскі – бальш.
Вілейскі павет	**Навагрудскі павет**
м. Лебедзева – Ян Якуновіч м. Вілейка м. Хаценчыцы м. Ільля м. Радашкавічы м. Даўгінава	в. Любча – В. Берасневіч м. Турэц – Б. Варэнюк
Пастаўскі павет:	**Валожынскі павет:**
м. Дуніловічы в. Канстантынава в. Порплішча м. Новы Мядзель в. Бруны в. Узла в. Таўруць	в. Гута гм. Сабозніцкая – І. Андрушкевіч м. Суботнікі – І. Антока і Т. Тучкоўскі м. Дзевянішкі – Малачэльнік

Крыніца: Centralne Archiwum Wojskowe, Oddział II Sztabu Generalnego, sygn. I.303.4.2696. s. 199-201.

Найбольш дакладную інфармацыю ўтрымліваюць дакументы аб мясцовых гуртках Беларускага Інстытута Гаспадаркі і Культуры, які на працягу дзесяці гадоў функцыянаваў як культурна-асветніцкая арганізацыя, што знаходзілася пад непасрэдным кіраўніцтвам лідэраў БХД. Па праведзеных намі падліках гурткі БІГіК у розны час існавалі больш чым у 100 мясцовасцях Заходняй Беларусі. Яшчэ ў некалькіх дзесятках вёсак, гарадоў і мястэчак рабіліся спробы заснаваць гурткі, якія, аднак, не былі легалізаваны ўладамі[5].

Іначай выглядала справа з арганізацыяй гурткоў уласна Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі. Калі адміністрацыя на месцах усяляк супраціўлялася нават стварэнню гурткоў БІГіК, то, зразумела, стварэння структур палітычнай партыі, якой была БХД, улады стараліся не дапусціць любым коштам. Напрыклад, ініцыятара стварэння гуртка БХД у вёсцы Нароты Ашмянскага павета два дні пратрымалі ў арышце, усіх астатніх, хто запісаўся ў гурток, прымусілі некалькі разоў наведаць паліцэйскі пастарунак[6]. Таму ў сакавіку 1927 года ЦК БХД надрукаваў камунікат наступнага зместу: „Многія прыхільнікі БХД зьвяртаюцца ў Цэнтральны Камітэт, просячы выслаць ім патрэбныя друкі дзеля арганізаваньня на мяйсцох гурткоў і запісі ў сябры БХД. Вось-жа гэтым паведамляем, што Цэнтральны Камітэт покульшто замест арганізаваць гурткі ўважае за патрабнейшае ўпісвацца ў сябры БХД безпасярэдна праз Цэнтральны Камітэт. Дзеля гэтага ўсіх нашых аднадумцаў просім зварочвацца ў Цэнтральны Камітэт аб высылцы ім дэкларацыяў. Запоўніўшы дэкларацыі просім слаць іх у ЦК, які, калі кандыдата на сябру БХД будзе ўважаць за адпаведнага, вышле яму партыйны білет[7]". Падобны крок кіраўніцтва БХД трэба прызнаць разумным. Персанальнае прыняцце ў члены партыі праз Вільню дазваляла фарміраваць партыйныя спіскі хаця б у адноснай канспірацыі ад польскай паліцыі на месцах. Не было таксама неабходнасці зацвярджаць гурткі ў гміне і павеце. ЦК БХД таксама атрымоўваў дадатковую магчымасць праверыць кандыдата, чаго не магло быць у выпадку, калі б у партыю прымалі цэлым гуртком. Менавіта таму БХД, якая па звестках польскай паліцыі налічвала каля 2 тыс. актывістаў, фактычна мела вельмі мала мясцовых гурткоў. Як правіла, работу ў хрысціянска-дэмакратычным духу вялі члены БІГіК, якія адначасова з'яўляліся членамі БХД.

Атрымоўвалася, што некалькі актывістаў БХД у той або іншай мясцовасці, правёўшы адпаведную падрыхтоўчую працу, стварылі там гур-

[5] Паводле В. А. Палуяна БІГіК меў каля 80 гурткоў з агульным лікам каля 1200 членаў (гл.: В. А. Полуян, *Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии*, Минск 1978, с. 267).

[6] „Biełaruskaja Krynica", 1927, 28.01, № 5, s. 3.

[7] „Biełaruskaja Krynica", 1927, 09.03, № 13, s. 4.

ткі БХД ці БІГіК, якія мелі ўжо поўнае права з большым размахам заняцца культурнай і грамадскай працай сярод сваіх землякоў. Падобным чынам фарміраваліся гурткі БХД і БІГіК у вёсках Орля і Пашычы Лідскага павета, мястэчку Іказнь на Браслаўшчыне[8].

Трэба адначыць, што кіраўніцтва БХД і БІГіК, у адрозненне ад беларускіх партый радыкальнага накірунку, накшталт БСРГ, ніколі не кіраваліся прынцыпам максімальнага павелічэння колькасці членаў гурткоў і лічыла, што ў вёсцы дастаткова 3-5 актывістаў для разгортвання эфектыўнай культурнай і грамадскай работы. „Высьцерагайцеся ўсялякіх благіх людзей, каторые або сябе закопваюць, або каго іншага, ганіце вон правакатараў, прайдзісветаў і рознага роду „цёмныя бутэлькі", у каторых няведама што крыецца. Бярэце людзей чэсных, каторыя хочуць шчыра працаваць дзеля свайго бяздольнага народу", — пісаў кс. В. Гадлеўскі старшыні аднаго з вясковых гурткоў БІГіК[9].

Большасць гурткоў БХД і БІГіК існавала ў вёсках, населеных каталікамі (Віленска-Троцкі, Свянцянскі, Пастаўскі, Ашмянскі паветы Віленскага ваяводства, а таксама Баранавіцкі павет Навагрудскага ваяводства), аднак, прааналізаваўшы канфесійны склад насельніцтва вёсак, дзе былі гурткі Інстытута, можна прыйсці да высновы, што даволі шмат гурткоў стваралася ў чыста праваслаўных вёсках, асабліва на Беласточчыне і ў Навагрудскім ваяводстве (в. Белая Бельскага павета, в. Вольная і Люшнева Баранавіцкага пав., в. Вялікая Ліпа і Бурачкі Нясвіжскага пав. і інш.)[10].

У сваю чаргу, беларускія хрысціянскія дэмакраты за ўсё міжваеннае дзесяцігоддзе так і не змаглі заснаваць ніводнай лакальнай структуры сярод беларускага каталіцкага насельніцтва Сакольскага і Гродзенскага паветаў Беластоцкага ваяводства. Калі ў першай палове 1920-х гг. „Крыніца" друкавала даволі значную колькасць карэспандэнцый і лістоў з гэтых мясцін, то ўжо ў сярэдзіне 1930-х гг. карэспандэнцый з Сакольшчыны ў „Крыніцы" і „Хрысціянскай Думцы" амаль няма. Патлу-

[8] „Biełaruskaja Krynica", 1927, 18.03, № 12, s. 1. Ужо летам 1927 г. мясцовыя арганізацыі беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў дамагліся пэўных поспехаў на мясцовых выбарах. У Віленскім ваяводстве прадстаўнікі БХД занялі ў мясцовых гмінных радах 19 месцаў, аднак, гэты поспех у тагачасных умовах можна было лічыць толькі часовым (гл.: *Революционное движение в Вильнюсском крае. 1920-1940 гг.: сб. докум. и матер.*, редкол.: Р. Малюкявичус (отв. ред.) [и др.], Вильнюс 1978, с. 137).

[9] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей: НА РБ), фонд 880, вопіс 1, справа 15, аркуш 189.

[10] *Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej, opracowany na podstawie wyniku pierwszego powszechnego spisu ludności z dn. 30 września 1921 r. i innych źródeł urzędowych*, t. V: *Województwo Białostockie*, Warszawa 1924, s. 25; tamże, t. V: *Województwo Nowogródzkie*, Warszawa 1923, s. 3, 45, 67, 84.

мачыць гэтую з'яву можна хуткай паланізацыяй мясцовага насельніцтва, якое яшчэ ў пачатку XX ст. вылучалася актыўным удзелам у беларускім каталіцкім руху.

Прааналізаваць узроставы склад і маёмасны стан членаў лакальных структур БІГіК складана, паколькі ў заявах на стварэнне гурткоў падаваліся, як правіла, выключна імёны і хатнія адрасы кандыдатаў. Падрабязную інфармацыю аб кандыдатах у члены гуртка БІГіК утрымоўвае толькі заява на легалізацыю гуртка ў Беластоку (дарэчы, мясцовыя ўлады ў канцы 1935 г. адмовілі ў легалізацыі гэтага гуртка). Кандыдаты мелі ўзрост ад 25 да 37 гадоў, сярэдні ўзрост быў прыкладна 31 год. Па прафесіі гэта былі шэсць фабрычных рабочых, маляр, шафёр, тэлеграфіст і адзін чалавек, які займаўся „разумовай працай"[11]. Дадзены гурток, як гарадскі, быў даволі незвычайным у параўнанні з асноўнай масай вясковых гурткоў, але і іншыя крыніцы пацвярджаюць той факт, што большасць членаў лакальных структур БХД і БІГіК складалі людзі даволі маладога веку, але ўжо гаспадары, часта сямейныя, з мінулым грамадскіх ці палітычных актывістаў. Людзей сталага ўзросту было няшмат, яны складалі найбольш кансерватыўную, традыцыйную і ізаляваную ад грамадскага жыцця частку вясковай супольнасці. Аднак у некаторых мясцовасцях і старэйшыя вяскоўцы далучаліся да культурна-асветніцкай працы хадэкаў. Яскравы прыклад — асоба Тамаша Трызны, старэйшага беларускага дзеяча з в. Жодзішкі. У пачатку 1927 г. карэспандэнт газеты „Беларуская Крыніца" паведамляў з гэтай вёскі: „толькі аднаму сталаму чалавеку, вельмі паважанаму гр. Т. Трызьне належыцца вялікая падзяка ад усяго грамадзянства, які свой вольны час аддае шчыра на карысную культурную працу, вучачы сяброў песьням і кіруючы беларускім хорам"[12].

З маладога ўзросту членаў БІГіК часта вынікалі і праблемы. „Нашы сябры — дзеці вайны, без ніякага выхаваньня і навукі," — пісаў кс. Вінцэнту Гадлеўскаму старшыня гуртка ў в. Белая Бельскага павета, пішучы пра бойку з панажоўшчынай, якая ўзнікла падчас вечарыны, арганізаванай Інстытутам[13]. Праўда, падобныя інцыдэнты ўзнікалі надзвычай рэдка.

Даволі шмат у мясцовых гуртках БІГіК было жанчын, што, безумоўна, з'яўлялася сведчаннем мадэрнізацыі беларускай вёскі, павелічэннем ролі жанчыны ў грамадскім жыцці. У некаторых гуртках жанчыны складалі прыкладна 20-25% ад агульнай колькасці членаў. Асабліва варта згадаць жанчын — кіраўнічак гурткоў Інстытута — Міхаліну Татарыновіч (в. Мядзведзічы Баранавіцкага пав.) і Анастасію Шумскую (в. Парослы Беластоцкага пав.). Сястра ксяндза Пятра Татарыновіча

[11] НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 15, а. 55.
[12] „Biełaruskaja Krynica", 1927, 28.01, № 5, s. 3.
[13] НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 15, а. 188.

Міхаліна арганізавала ў сваім гуртку каля 60 чалавек, спрычынілася да пабудовы народнага дому, пісала ў заходнебеларускія газеты.

Цікава таксама звярнуць увагу на той факт, што ў некаторых хадэкаў прасочваўся яўны „канфлікт пакаленняў". Больш сталыя гаспадары падтрымлівалі БХД, а іх радыкальна настроеныя дзеці былі камуністамі. Найбольш яскравы прыклад — сям'я знакамітага беларускага паэта Валянціна Таўлая. Яго бацька Павел Таўлай, былы мясцовы кіраўнік БСРГ і войт гміны, які правёў нейкі час у турме, узначальваў у канцы 1920-х гурток БІГіК у вёсцы Рудаўка, у той час як яго сын быў ужо вядомым паэтам камуністычнага кірунку[14].

Асобным накірункам дзейнасці беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў у справе ўмацавання сваіх лакальных структур была спроба стварэння сістэмы беларускага нацыянальнага школьніцтва. У другой палове 1926 года беларускія хадэкі арганізавалі падачу заяў на заснаванне больш дваццаці школ з беларускай мовай выкладання. У большасці выпадкаў адміністрацыя проста праігнаравала заявы на адкрыццё школ, яшчэ ў некалькіх выпадках дазволы на адкрыцё школ не былі дадзеныя па фармальных прычынах (адсутнасць санітарных умоў і г.д.), некаторых асоб, прапанаваных на настаўнікаў, адміністрацыя адхіліла[15]. У выніку беларускім хадэкам удалося адкрыць толькі дзве прыватныя беларускія школы — у Шаўлянах Браслаўскага павета і Рудаўцы Слонімскага павета. Гэтыя школы не мелі ніякай дзяржаўнай падтрымкі, аднак карысталіся немалой папулярнасцю. Напрыклад, беларускую школу ў Шаўлянах апрача каталікоў наведвалі таксама дзеці праваслаўных і некалькі хлопцаў і дзяўчат з сем'яў рускіх старавераў.

Надзвычай вялікі ўклад у справу выжывання беларускіх прыватных школ, створаных хадэкамі, зрабілі настаўніцы Стэфанія Таўлай (мачаха Валянціна Таўлая) і Марыя Булыга. Аднак паступова функцыянаванне беларускіх школ пераўтварылася ў барацьбу за выжыванне. БІГіК з цяжкасцю аплачваў выдаткі на школы, а мясцовая адміністрацыя ўсяляк перашкаджала іх працы. Нагодай для спагнанняў станавілася, напрыклад, адсутнасць у школе герба Польшчы ці невыкарыстанне дзяржаўных, надрукаваных лацінкай беларускіх лемантароў Станіслава Любіч-Маеўскага. У выніку М. Булызе было адмоўлена ў выдачы „пасведчання аб маральнасці". Да 1933 г. абедзве школы спынілі існаванне.

Тым не менш, барацьба за беларускую школу працягвала заставацца адным з галоўных накірункаў працы беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў і сродкам пашырэння іх уплываў, хаця рэальнага выніку ў выглядзе заснавання беларускіх прыватных школ больш не мела. Так у 1929 г.

[14] НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 7, а. 30.

[15] Напрыклад, настаўніку Д. Дожыну (в. Малы Угрын) было адмоўлена з нагоды яго „нелаяльнага стасунку да дзяржавы", НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 5, а. 26.

Цэнтральны Урад БІГіКа надрукаваў і разаслаў 8 тыс. школьных дэкларацый і 2 тыс. інструкцый. У выніку былі пададзены заявы на заснаванне трох беларускіх школ[16]. Вялікім маштабам вылучалася г.зв. „школьная акцыя", праведзеная разам БІГіК і ТБШ у 1936 г., якая і стала фармальнай нагодай для спынення дзейнасці Інстытута.

Табліца 3. **Спіс унесеных Беларускім Інстытутам Гаспадаркі і Культуры да 1.X.1926 г. просьбаў аб дазволе адчыніць прыватныя беларускія школы**

На школу ў мясцовасці	Заўвага
в. Рудаўка, Мядзведзіцкая гм., Слонімскі павет *№ 50, 6.IX.26*	адказу не было *канцэсія атрыманая*
в. Малы Угрын, гм. Дзярэчын, Слонімскі павет *№ 41, 6.VIII.26.*	адказу не было *канцэсія атрыманая*
в. Асташын, гм. Цырын, Навагрудскі павет *№ 21, Ежы Кухарчык, Гарадзішча.*	адказу не было
в. Лубанічы, гм. Цырын, Навагрудскі павет *№ 22, Тлоско (?) Апанас, Гарадзішча.*	адказу не было
в. Ачукевічы, гм. Любча, Навагрудскі павет *№ 57, 30.IX.26 Хартановіч Навум з Ачукевіч*	адказу не было
в. Лукі, гм. Жухавічы, Стаўбцоўскі павет *№ 23, 22.VII.26.*	просьба вернутая з патрабаваннем засведчання подпісаў сяброў Ураду і паштовай аплаты
в. Смолічы, гм. Ласуны, Нясвіжскі павет	адказу не было
в. Леановічы, гм. Лань, Нясвіжскі павет	адказу не было
в. Цяколаўшчына, гм. Ласуны, Нясвіжскі павет	адказу не было
в. Анісімавічы, гм. Новая Мыш, Баранавіцкі павет *№ 48, Канст. Шэмет, Палачанскі, Баранавічы, Калеёвая, 3.*	адказу не было
в. Барадзенічы, гм. Ёды, Браслаўскі павет *№ 27, 4.VIII.26, настаўнік Л.(?) Барысёнак* [мясцовасць неразборліва – аўт.], *павет Дзісна*	канцэсія атрыманая, не зацвердзваецца настаўнік *паданы новы кандыдат п. Барысёнак*
в. Цяцеркі, гм. Ёды, Браслаўскі павет *№ 49, 6.IX.26, настаўнік Бал. Пятровіч* [мясцовасць неразборліва – аўт.], *Брасл. п.*	адказу не было *канцэсія атрыманая*
в. Шаўляны, гм. Ёды, Браслаўскі павет *№ 51, 22.IX.26, Марыя Булыка, в. Салакоўшчына, гм. Ёды*	адказу не было *канцэсія атрыманая*
в. Домуці, гм. Лынтупы, Свянцянскі павет *№ 52, 23.IX.26*	канцэсія не атрыманая
в. Сярэдняе Сяло, гм. Пяршаі, Валожынскі павет *№ 5 (?), 24.IX.26, Сцяпан Кулік, Сяр. Сяло*	адказу не было
в. Ядзейкі, гм. Гарадок, Маладзечанскі павет *№ 54, 24.IX.26, Якуб Кулік, Сяр. Сяло, гм. Пяршаі*	адказу не было
в. Долкі, гм. Ружана, Косаўскі павет *№ 42, 6.VIII.26, настаўнік Тамаш Ахрэмень (?) з вёскі Долкі*	просьба вернутая з патрабаваннем паштовай аплаты
в. Зарэчча, гм. Шэрашаў, Пружанскі павет *№ 56, настаўнік (імя неразборліва) Субота, жыхар Зарэчча*	адказу не было
***Галубоўшчына**, гм. Прыброддзе (?), Браслаўск. пав. (Віл. аддз.)*	
***в. Семянішкі,** Брасл.*	

Дакумент-машынапіс, усе словы, упісаныя ад рукі, падаюцца курсівам.
Крыніца: НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 5, а. 15.

У працэсе стварэння структур на вёсцы актывістам БІГіК часта прыходзілася супрацьстаяць польскім грамадскім арганізацыям, якія актыўна падтрымліваліся ўладамі. Можна, аднак, сцвердзіць, што ў тых

[16] НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 4, а. 3 адв.

мясцінах, дзе паралельна польскім „сельскагаспадарчым колкам" і „колкам моладзі" стваралiся гурткі БІГіК, апошнія паспяхова вытрымлівалі канкурэнцыю, хаця і не мелі дзяржаўнай падтрымкі. У некаторых выпадках да кіраўніцтва БІГіК звярталіся і актывісты польскіх арганізацый. Так Р. Матусевіч, старшыня сельскагаспадарчага колка ў в. Заельня Грыцавіцкай гміны Нясвіжскага павета пісаў старшыні БІГіК: „Мне, як беларусу, вочынь хацелась-бы, каб былі ў нашай бібліятэчке беларускія кнігі, бо польскіх хаця-ж і маем экземпляраў 300 ніхто ніколі ня чытае"[17].

Апрача польскай адміністрацыі найбольш актыўна разгортванню структур беларускай хадэцыі супраціўляліся актывісты Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ). Рабілася гэта ў першую чаргу прапагандысцкімі сродкамі (выданне камуністычных газет і лістовак лацінскім шрыфтам, распаўсюджанне брашур, дзе ачарнялася дзейнасць БХД), аднак канфліктаў паміж камуністамі і хадэкамі на лакальным узроўні дакументы амаль не зафіксавалі[18]. Мясцовыя актывісты КПЗБ часта не разумелі, чаму яны павінны канфліктаваць са сваімі аднавяскоўцамі, якія таксама змагаюцца за правы беларускага народа ў межах Польшчы, таму фактычна ігнаравалі загады партыйнага кіраўніцтва аб узмацненні канфрантацыі з беларускімі хрысціянскімі дэмакратамі. Наступным чынам узаемаадносіны хадэкаў і камуністаў у наваельнінскім раёне на Навагрудчыне апісваў прысланы ў раён з ЦК КПЗБ партыйны актывіст: „Мы выступили на районном комитете и поставили вопрос, что нужно более решительно бороться с хадеками, ибо эти люди теперь особенно опасны, на заседании Райкома члены РК молчали, а потом выяснилось, что этот хадек является родственником одного из этих членов райкома и они в самых лучших отношениях. Этого хадека везде выставляли как нашу легальную пляцовку"[19]. Даходзіла і да кур'ёзных выпадкаў. Напрыклад, кіраўніцтва КПЗБ прыняло рашэнне бясплатна высылаць суполкам хадэкаў на Навагрудчыне пракамуністычную легальную „Беларускую Газету", што выдавалася ў Вільні. У выніку атрымалася, што прыхільнікі БХД у ваколіцах Наваельні атрымлівалі камуністычнае выданне, а актывісты КПЗБ нідзе не маглі яго дастаць, бо пра іх віленскае кіраўніцтва проста забылася[20].

Часта, аднак, падобныя правакацыі камуністаў, асабліва ў тых выпадках, калі па пошце актывістам БІГіК прысылалася нелегальная ка-

[17] НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 16, а. 53.

[18] А. Ф. Вашкевіч, *Супрацоўніцтва БХД і КПЗБ (восень 1935 — восень 1936 гг.)*, „Беларускі гістарычны часопіс", 2006, № 10, с. 19-20.

[19] НА РБ, ф. 242-п, воп. 1, спр. 390, а. 292.

[20] Там жа. Па некаторых ускосных дадзеных можна меркаваць, што гэтыя падзеі адбываліся ў ваколіцах вёскі Варакомшчына, што каля Наваельні.

муністычная літаратура, заканчваліся трагічна, бо давалі паліцыі нагоду знішчаць гурткі БІГіК. Так у ліпені 1930 г. у гуртку БІГіК у Свірыдавічах Смаргонскай гміны быў праведзены вобыск. Пасля гэтага па падазрэнню ў „распаўсюджанні камуністычнай літаратуры" паліцыя арыштавала скарбніка гуртка Ул. Чыжэўскага (на адрас Ул. Чыжэўскага па пошце была прыслана камуністычная прэса), а дзейнасць гуртка была спынена[21]. Толькі ў снежні 1930 г. суд даказаў невінаватасць Ул. Чыжэўскага і той пасля амаль шасці месяцаў, праведзеных у турме, выйшаў на свабоду[22]. Кіраўніцтва БІГіК падало заяву на аднаўленне дзейнасці свірыдавіцкага гуртка, аднак кіраўнік аддзела бяспекі віленскага ваяводства адказаў, што „не бачыць падставаў" для аднаўлення дзейнасці гуртка[23]. Падобнага кшталту акцыі польскай паліцыі суправаджаліся гучнымі кампаніямі ў прэсе, накіраванымі на кампраметацыю арганізацый, звязаных з беларускімі хрысціянскімі дэмакратамі.

Функцыянеры польскай паліцыі свядома атаясамлівалі дзейнасць усіх беларускіх арганізацый з „камунізмам", хаця ў большасці выпадкаў выдатна ўсведамлялі, што да камуністаў беларускія хадэкі не маюць ніякага дачынення. Па сутнасці, знішчэнне беларускіх арганізацый незалежніцкага накірунку, асабліва тых, што карысталіся ўплывамі на вёсцы, было выгадна і камуністам, і польскай адміністрацыі. Першыя падкрэслівалі прыслужніцтва беларускіх хадэкаў перад „фашыстоўскім польскім урадам", другія без перапынку абвінавачвалі іх у „антыдзяржаўнай камуністычнай дзейнасці", хаця сёння выдатна вядома, што галоўнай сваёй мэтай абодва бакі ставілі поўную ліквідацыю ўсіх беларускіх арганізацыйных структур[24]. „Адміністрацыя для польскіх арганізацыяў — шчодрая матка, а для беларускіх — Дунін-Марцінкевічаўская мачыха. Яна не варожая для закладчыкаў, але да іхнай беларускасьці, да беларускай арганізацыі, як такой, ня гледзячы на ейны характар, ці то культурна-прасьветны, ці то гаспадарча-кааператыўны, ня гаворачы ўжо аб палітычнай. Калі я панёс у Стараства гэрбавую аплату на заяву, то рэфэрэнт „biezpieczeństwa" Завадзкі рознымі спосабамі ўгаворваў мяне, каб мы „wycofali" заяву на Інстытут, а залажылі „Koło Młodzieży Wiejskiej", з якога абяцаў нам вялікія карысьці: дапамогу матэрыяльную, бібліотэку, урадавых лектароў і іншые," — пісаў кс. В. Гадлеўскаму адзін з беларускіх актывістаў, які ў 1935 г. беспаспяхова спрабаваў легалізаваць гур-

[21] НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 4, а. 14 адв. Толькі ў 1930-1931 гг. па прычыне падобных правакацый польская паліцыя спыняла дзейнасць гурткоў БІГіК у Свірыдавічах, Малой Боркаўшчыне і Асінаўцы.

[22] „Kurjer Wileński", 1930, 21.12, s. 3.

[23] НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 5, а. 187.

[24] E. Mironowicz, *Białorusini, komunizm i władze sanacyjne w latach 1937-1939*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne", 2006, nr 25, s. 102-115.

ток БІГіК у в. Мондзін на Навагрудчыне[25].

Нягледзячы на актыўную грамадскую і культурную працу беларускіх хадэкаў, колькасць іх лакальных структур з пачатку 1930-х гг. пачала памяншацца. Так, калі ў 1929 г. БІГіК меў 69 гурткоў, то ў 1933 г. іх колькасць скарацілася да 54, а ў 1935 г. складала ўсяго 33 гурткі[26]. Паступовае змяншэнне колькасці гурткоў БІГіК можна патлумачыць найперш як рэзультат мэтанакіраванай палітыкі польскага ўрада на поўную ліквідацыю беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў межах тагачаснай Польшчы. Рэпрэсіі супраць вясковых актывістаў БХД набывалі самую разнастайную форму, ад вобыскаў, застрашвання і арыштаў да штрафаў, падатковага ўціску, нявыдачы дазволаў на правядзенне спектакляў, утрыманне бібліятэчак і вялі свой пачатак з самых першых месяцаў існавання БХД і БІГіК. Так ранкам 15 студзеня 1927 г. у хату старшыні гуртка БІГіК у в. Перхавічы Баранавіцкага павета Яна Дзяшкоўскага прыйшлі шэсць паліцэйскіх і правялі вобыск, праводзячы яго хутчэй з мэтай застрашвання, чым пошуку якіх-небудзь доказаў злачыннай дзейнасці гуртка. На наступны дзень Я. Дзяшкоўскі быў арыштаваны і некалькі дзён правёў у пастарунку[27]. 21 сакавіка гэтага ж года паліцыя абшукала хату старшыні гуртка БІГіК у в. Парослы Беластоцкага павета. Было канфіскавана шмат беларускіх кніжак, справаводства і перапіска гуртка. Старшыня гуртка Анастасія Шумская, нягледзячы на пагрозы, не аддала паліцэйскім пячаткі гуртка[28]. Такіх прыкладаў было, безумоўна, нашмат болей.

Асаблівай формай уціску з боку адміністрацыйных улад сталі шматлікія грашовыя зборы, напрыклад, у выглядзе т.зв. „opłaty stęplowej". Павятовыя старасты, карыстаючыся пунктам у статуце БІГіК аб тым, што арганізацыя можа займацца эканамічнай дзейнасцю, пачалі патрабаваць прыклейваць да заяў на правядзенне культурных мерапрыемстваў маркі грашовай аплаты. У выніку падача заявы на правядзенне спектакля каштавала 10 злотых. Паколькі даход ад аднаго спектакля складаў у сярэднім усяго 50 злотых, а ніякай гарантыі, што стараста гэты спектакль увогуле дазволіць не было, арганізацыя беларускіх вечарын і спектакляў пераўтваралася не толькі ў беспрыбытковую, але і фінансава стратную для сяброў Інстытута справу. У сваю чаргу падача дэкларацыі на адкрыццё беларускай школы ў такой сітуацыі каштавала больш за 20 злотых, што складала двухтыднёвы заробак селяніна-падзёншчыка[29]. Асабліва актыўна такая форма ўціску выкарыстоўвалася ў Навагрудскім ваяводстве. У жніўні 1935 г. кс. В. Гадлеўскі ў ліс-

[25] НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 15, а. 84 адв.
[26] НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 4, а. 3, 11.
[27] НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 5, а. 89.
[28] НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 5, а. 90.
[29] НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр 16, а. 11.

це да кіраўніцтва аднаго з гурткоў БІГіК канстатаваў: „З усяго відаць, што Наваградзкае ваяводзтва ідзе да спыненьня дзейнасьці Інстытуту па ўсім абшары ваяводзтва. Вымаганьні аплатаў за кожную дробязь стасуюцца ня толькі да Вас, але бадай ва ўсіх паветах”.

У сувязі з паступовай эвалюцыяй палітычнага рэжыму Польшчы ў бок адмовы ад палітычных свабод, росту рэпрэсій супраць нацыянальных меншасцей легалізацыя гурткоў БХД (пасля Беларускага Народнага Аб’яднання) і БІГіК стала фактычна немагчымай, бо з пяці-шасці новых гурткоў атрымоўвалі дазвол на працу максімум адзін-два. Напрыклад, у 1935 г. кіраўніцтва БІГіК спрабавала зарэгістраваць чатыры гурткі арганізацыі, аднак дазвол быў атрыманы толькі на стварэнне гуртка ў в. Лядкі Стаўбцоўскага павета. Але і гэты гурток праз некалькі месяцаў быў зачынены[30]. Пры гэтым чыноўнікі нават не абцяжарвалі сябе грунтоўнымі тлумачэннямі адмоў, пішучы, напрыклад, што гурток БІГіК не можа быць легалізаваны, паколькі „ёсць падставы меркаваць, што дзейнасць гуртка будзе выходзіць за межы, акрэсленыя статутам”[31].

Спробы заснаваць гурткі БІГіК рабіліся фактычна да моманту афіцыйнай забароны арганізацыі ў канцы 1936 г. У маі 1936 г. была пададзена заява на заснаванне гуртка ў в. Сенкавічы Івацэвіцкай гміны, у верасні на стварэнне гуртка ў в. Беражна Мірскай гміны[32]. Змучаныя барацьбой за захаванне свайго гуртка актывісты з в. Лядкі пісалі, што калі гурток будзе зачынены, то яны гатовыя заснаваць у сваёй вёсцы гурток Беларускага Народнага Аб’яднання (БНА)[33]. Але заснаваць мясцовы гурток беларускай палітычнай партыі было ў той час ужо амаль немагчыма. Безумоўна, колькасць хадэцкіх пляцовак у вёсках і мястэчках Заходняй Беларусі ў 1935-1936 гг. была ў сапраўднасці большай, чым падавала афіцыйнае справаводства. Нягледзячы на ліквідацыю мясцовай адміністрацыяй гурткоў БІГіК, многія з іх працягвалі працаваць фактычна ў падполлі, дзякуючы найбольш трывалым і адукаваным актывістам. Так у сакавіку 1935 г. Вінцэнт Пераход, былы старшыня гуртка ў в. Новая Мыш Баранавіцкага павета, пісаў: „Хацяж у нас зліквідавалі гурток БІГіКу, алеж жыцьцё Беларускае ў нас кіпіць. Збіраемся вечарамі, чытаем кніжкі Беларускіе, ведзём дыспуты на конт нашай справы Беларускай і г.д.”[34]. Падобнае становішча захавалася да верасня 1939 года.

[30] НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 4, а. 11.

[31] НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 15, а. 88.

[32] 2 кастрычніка 1936 г. Галоўны ўрад БІГіК прыняў рашэнне стварыць акружныя аддзелы ў Мядзведзічах, Жодзішках і Шальцінах, аднак рашэнне гэтае фактычна засталося на паперы, бо ўжо 4 снежня БІГіК быў зачынены пастановай Віленскага ваяводы. НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 16, а. 6, 20, 28.

[33] НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 16, а. 23.

[34] НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 15, а. 123.

Такім чынам, на працягу 1920-1930-х гг. беларускія хрысціянскія дэмакраты змаглі стварыць даволі разгалінаваную сетку сваіх гурткоў у вёсках і мястэчках Заходняй Беларусі. Значную частку актывістаў БХД складалі праваслаўныя беларусы, а гурткі БХД і БІГіК часта ствараліся ў чыста праваслаўных мясцовасцях. Тым не менш, галоўнай апорай беларускіх хадэкаў з'яўляліся вясковыя асяродкі беларусаў каталіцкага веравызнання. Гэтыя супольнасці, падтрыманыя беларускімі ксяндзамі, актыўна прапагандавалі ідэю беларусізацыі каталіцкага жыцця. Менавіта таму гэтыя асяродкі ва ўмовах знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы, кіраўніцтва якой фактычна атаясамляла каталіцкае веравызнанне з польскай нацыянальнасцю, з'яўляліся для польскіх улад адной з галоўных небяспек на тэрыторыі „Усходніх Крэсаў". Польская адміністрацыя ў Заходняй Беларусі ўсведамляла гэты факт і прымала рашучыя меры па ліквідацыі лакальных структур БХД, што да канца 1930-х гг. у цэлым было рэалізавана. Тым не менш, нягледзячы на фармальную ліквідацыю ўсіх лакальных структур беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў, выключна жорсткія абмежаванні для ўжывання беларускай мовы ў касцельным богаслужэнні, поўную забарону доступу ў рыма-каталіцкія духоўныя навучальныя ўстановы для маладых людзей, якія дэкларавалі беларускую нацыянальнасць, спыніць павелічэнне колькасці нацыянальна свядомага беларускага насельніцтва сярод рыма-каталікоў Заходняй Беларусі было ўжо немагчыма. Так, калі паводле перапісу 1921 года, з 1 млн. 35 тыс. беларусаў, што жылі ў паўночна-ўсходніх ваяводствах Польшчы, было толькі 60,1 тыс. каталікоў, то паводле перапісу 1931 г. з 990 тыс. беларусаў да каталіцкага веравызнання належала ўжо больш за 74 тысячы чалавек, што складала каля 8% ад агульнай колькасці ўсіх каталікоў Заходняй Беларусі[35]. Працэс павелічэння колькасці каталікоў-беларусаў асабліва актыўна ішоў акурат у тых паветах, дзе найбольшымі ўплывамі карысталіся беларускія хадэкі (Свянцянскі, Пастаўскі, Віленскі і інш.)[36]. Большасць каталікоў-беларусаў прыйшлі да сваёй нацыянальнай свядомасці шляхам унутранай эвалюцыі, таму з'яўляліся даволі актыўнымі асобамі ў рэлігійным і грамадскім жыцці, будучы, па сутнасці, электаратам і галоўнай апорай беларускіх хрысціянскіх дэмактараў. Цытаваны вышэй Вінцэнт Пераход вельмі ўдала выказаўся аб усіх тых небяспеках, якія маглі чакаць вясковага беларускага актывіста-незалежніка: „Усім былі страхі, што паліцыя на іх глядзіць крыва, што ксёндз

[35] Ю. Грыбоўскі, *Беларусы ў польскіх рэгулярных вайсковых фармаваннях 1918-1945 гадоў*, Санкт-Пецярбург 2006, с. 11; С. М. Токць, *Беларуская вёска ў эпоху зьменаў. Другая палова XIX — першая траціна XX ст.*, Менск 2007, с. 148.

[36] А. Ф. Вашкевіч, *Навуковая спадчына ксяндза Вінцэнта Гадлеўскага*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne", 2006, nr 26, s. 221.

паляк скажа — беларусы „гэта бязбожнікі і кара Божая вас не міне”. Усе баяліся, адно мне не было страху, ня арышт і вязніца слонімска, у каторай сядзеў, ня пратаколы, каторыя паліцыя на мяне састаўляла, ня барацьба з сільнымі партыямі польскімі... нічога мяне не ўстрашало сказаць публічна усіем і усягды, што край наш ёсць Беларускі і мы ўсе Беларусы і што мы павінны мець сваю незалежнасць як і іншые народы”[37].

Streszczenie

Do połowy lat dwudziestych struktury związane z Białoruską Chrześcijańską Demokracją powstawały wokół kościołów w postaci kół kierowanych przez księży Białorusinów. Gazeta związana z partią na początku 1925 r. miała 870 stałych prenumeratorów. Najwięcej w powiatach dziśnieńskim, oszmiańskim, święciańskim, wileńskim i grodzieńskim. Rozłam w ruchu białoruskim, który dokonał się za sprawą posłów z klubu Białoruskiej Włościańsko-Robotniczej Hromady, powstanie partii o takiej nazwie i jej dynamiczny rozwój postawiły chrześcijańskich demokratów przed koniecznością tworzenia własnych struktur organizacyjnych w postaci Białoruskiego Instytutu Gospodarki i Kultury. Koła Instytutu powstały w ponad stu miejscowościach Zachodniej Białorusi. Ze względu na przeciwdziałanie władz i tłumienie politycznego ruchu białoruskiego, aktywność BChD w drugiej połowie lat dwudziestych koncentrowała się w różnych formach działalności w Instytucie. Większość struktur BChD i BIGiK powstała w miejscowościach zamieszkałych przez katolików. Nie udało się powołać takich struktur jedynie w powiatach sokólskim i grodzieńskim województwa białostockiego, gdzie w połowie lat trzydziestych zaprzestano nawet czytania „Białoruskiej Krynicy”. Władze wojewódzkie w Białymstoku odmówiły nawet legalizacji koła BIGiK. Proces polonizacji katolików nabrał tu szczególnego przyspieszenia w drugiej połowie lat trzydziestych.

[37] НА РБ, ф. 880, воп. 1, спр. 15, а. 123-125.